ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.

№ 18 (775) ● Пятніца, 15 мая 1970 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXIII



## СВЯТА ЎСЯГО НАРОДА

Разам з усёй рэспублікай, з усімі народамі нашай шматнацыянальнай краіны урачыста адзначылі вялікае свята Перамогі студэнты і выкладчыкі нашага універсітэта. Яны пабывалі у экскурсіях, музеях, на памятных мясцінах баёу, усклалі вянкі і кветкі да помнікау героям.

На урачыстым сходзе, які адбыуся у актавай зале галоунага корпуса, з дакладам «25 год Перамогі» выступіу удзельнік Вялікай Айчыннай вайны начальнік вучэбнай часткі універсітэта В. С. Далгарукаў.

У перапынку урачыстага сходу адбылося адкрыццё мемарыяльнай дошкі у памяць загінуушых у час вайны з нямецка-фашысцкімі захопнікамі студэнтау, аспірантау, рабочых і служачых, прафесарау і выкладчыкау універсітэта. З пранікнёным словам у гэты урачысты момант выступіў рэктар БДУ акадэмік А. Н. Сеўчанка. Мінутай маучання прысутныя памянулі тых, хто аддау сваё жыццё у баях за Савецкую Радзіму.

У святочным канцэрце ў гонар 25-годдзя Перамогі выступіў ансамбль нямецкіх студэнтаў з Іенскага універсітэта імя Ф. Шылера.

**НА ЗДЫМКАХ:** выступаюць госці з Іены. В'етнамскія студэнты з падрыхтоучага факультэта ўскладаюць кветкі да падножжа манумента Перамогі. Тысячы людзей наведалі Курган Славы.

Фота М. НЕЧЫПАРЭНКІ.

## ВЕСТКІ З ФАКУЛЬТЭТАЎ

Матэматычны факультэт разам з газетай «Знамя юности» праводзіць завочную матэматычную алімпіяду, у якой прымаюць удзел у асноуным вучні дзесятых класау школ рэспублікі. Ужо падведзены вынікі першага тура. Пераможцамі яго сталі 317 юных матэматыкау.

У гэтыя дні праходзіць другі тур, у час якога выкладчыкі матэматычнага факультэта—дактары, прафесары, дацэнты —выедуць у 32 пункты рэспублікі для субяседаванняў з пераможцамі першага тура.

Пазаўчора у галоуным корпусе адбылася першая з такіх сустрэч. Ва універсітэт былі запрошаны школьнікі з Мінска і Мінскай вобласці.

Алімпіяда працягваецца. Пераможцы матэматычных спаборніцтваў атрымаюць перавагу перад іншымі абітурыентамі пры паступленні ва універсітэт.

●

12 мая адбылася першая у гэтым годзе абарона дыпломных работ студэнтаў-завочнікау юрыдычнага аддзялення. Усе 12 дыпламантау—супрацоунікі савецкіх і партыйных устаноу — атрымалі добрыя і выдатныя ацэнкі.

Так, напрыклад, работа Галіны Уладзіміраўны Савінай заслужыла самую высокую ацэнку — выдатна. Г. У. Савіна, сакратар выканкома Стаўбцоўскага райсавета дэпутатаў працоуных, працавала над тэмай «Прававое палажэнне і дзейнасць камісій па сацыялістычнай законнасці і ахове грамадскага парадку мясцовых Саветау дэпутатау працоуных». Гэта работа з'яуляецца абагульненнем практычнай дзейнасці пастаянных камісій па сацыялістычнай законнасці і ахове грамадскага парадку мясцовых Саветау дэпутатаў працоўных Стаўбцоўскага раёна.

●

Кожнае лета, пачынаючы з апошняй дзесяцідзёнкі мая, студэнты біялагічнага факультэта адпраўляюцца ў лясы, пушчы, на азёры, каб самастойна адкрыць, разгадаць некаторыя з мноства дзівосных таямніц прыроды.

Вось і сёлета усяго праз які тыдзень студэнты-біёлагі вячэрняга аддзялення раз'едуцца на практыку. На працягу дваццаці дзён яны будуць жыць і працаваць у Налібоцкай і Белавежскай пушчах, на Нарачанскай біялагічнай станцыі. Першакурснікі зоймуцца фаунай, будуць вывучаць водных жывёлін, якія уваходзяць у склад планктона, і насякомых.

Студэнты другога курса сканцэнтруюць сваю увагу на ніжэйшых раслінах — вывучаць лішайнікі, грыбы, водарасці, зоймуцца геабатанікай.

Галоўным напрамкам практыкі трэцякурснікау будзе заалогія беспазваночных жывёлін.

Такія ж тэмы разгледзяць і студэнты-біёлагі стацыянара. На практыку яны выедуць у сярэдзіне чэрвеня — пачатку ліпеня, пасля экзаменацыйнай сесіі.

Звычайна студэнты застаюцца вельмі задаволеныя тымі днямі, што праводзяць на практыцы. Асабліва добрае уражанне пакідае Налібоцкая пушча. Тут надзвычай добрыя прыродныя умовы. У імклівай рацэ Іслач водзіцца фарэль і харыус. Тут можна пабачыць магутныя дрэвы і рэдкія для Беларусі расліны, жывёл, птушак.

Выязджаюць студэнты для праходжання практыкі і за межы нашай рэспублікі: у запаведнік Асканія-Нова, на Белае мора ў Кандалакшскі запаведнік. Яны праводзяць даследаванні паўднёвых стэпау і тундры. За час практыкі збіраюць шмат цікавых, багата ілюстраваных матэрыялау, якія потым кладуцца у аснову курсавых і дыпломных работ.

●

*НА ЗДЫМКУ (уверсе): ідзе падрыхтоўка да пераддыпломнай практыкі. Студэнты чацвёртага курса геаграфічнага факультэта (злева направа) Раіса Яцык, Анатоль Бортнік, Валянціна Анкуд робяць аналіз глебы.*

*Фота Д. ЧАХОВІЧА.*







Давайце абмяркуем

# ЧАМУ АДДАЦЬ ПЕРАВАГУ?

На трэцім курсе студэнтам факультэта журналістыкі трэба прачытаць каля 140 твораў мастацкай літаратуры (дзве кнігі за тры дні), здаць 9 залікаў і 11 экзаменаў, напісаць дзве курсавыя работы. Так, аб'ём работы вялікі. А зараз звернемся да іншага.

Колькі часу ў суткі займае ў нас самастойная работа над кнігай? Лекцыі ва універсітэце — 6 гадзін, дарога — 1,5 гадзіны, харчаванне— 2 гадзіны, розныя бытавыя патрэбы— 1 гадзіна, праслухоўванне і прагляд радыё- і тэлевізійных перадач (абавязковае для студэнтаў кафедры радыё і тэлебачання) — 2 гадзіны, адпачынак —1,5 гадзіны, сон — 8 гадзін. Застаецца 4 гадзіны на самастойную падрыхтоўку. Я не гавару пра той час, які займае работа над матэрыяламі для газет, радыё, тэлебачання. Справа ў тым, што не ўсе студэнты супрацоўнічаюць у рэдакцыях.

Але ці так мы размяркоўваем свой час? Што і казаць. Здараецца, што час заняткаў і адпачынку мяняецца месцамі. Калі гэта ў некаторых бывае часта, то не дзіўна бачыць у час сесіі засмучаныя, збянтэжаныя твары аднакурснікаў. Вось толькі тады папракаем сябе за змарнаваны, не выкарыстаны на вучобу час.

У першы год навучання ў ВНУ, як ніколі, студэнту прадастаўлена самастойнасць. У кішэні ёсць грошы, хоць невялікія, але свае, не трэба аддаваць справаздачы бацькам, куды, чаго ідзеш і калі вернешся. Гэта самастойнасць часам прыводзіць да нежаданага выніку. Мы злоўжываем ёй, губляем кантроль над часам.

Адзін раз у тыдзень у нас бываюць практычныя заняткі. З шасці рабочых дзён пяць адводзіцца лекцыям. «Чаго ж рыхтавацца да іх — ніхто не пытае», — так разважае асноўная маса. Іншая справа практычныя, семінары. Хочаш не хочаш, а рыхтавацца трэба. Прыходзіць сесія, і тое, што пройдзена на гэтых занятках, застаецца толькі ўспомніць, прывесці ў сістэму. А прадметы, па якіх практычныя не праводзіліся, па сутнасці пачынаеш вучыць спачатку.

Дык што, калі зрабіць наадварот? Адвесці больш гадзін на практычныя і семінарскія заняткі, а скараціць колькасць лекцый. Гэта дазволіць выкладчыкам пастаянна назіраць за працай студэнтаў, выпраўляць памылкі, прадухіліць няправільнае тлумачэнне асобных паняццяў.

На мой погляд, мэта лекцыі павінна заключацца ў тым, каб сканцэнтраваць увагу студэнта на галоўных пытаннях, дапоўніць, расшырыць тое, аб чым не гаворыцца ў падручніку, прымусіць навучэнца самому задумацца над правільным вырашэннем той ці іншай праблемы. Гэта ажыццявіма толькі ў цеснай сувязі практычных заняткаў і лекцый. Тады не толькі выдатнікі, але і пасрэдныя студэнты будуць рэгулярна, з усёй сур'ёзнасцю рыхтавацца да заняткаў.

Канешне, не ўсім практычныя падабаюцца. Не вельмі прыемна трымаць адказ перад выкладчыкам, перад усёй групай за сваю лянoту.

Мабыць, варта падумаць і над тым, як павялічыць час самастойнай працы над падручнікам: увесці дні з меншай колькасцю вучэбных гадзін або стварыць дзень самападрыхтоўкі? Дарэчы, журналістам ён патрэбен як нікому. Часам рыхтуеш перадачу, а вось зрабіць запіс на рэпарцёр пасля заняткаў нельга. Тады і прапускаеш лекцыі.

Калі магчыма стварыць такі дзень, то не трэба разглядаць яго як уступку студэнту, а лічыць як новае сур'ёзнае патрабаванне. У такім разе студэнт не будзе апраўдвацца: «Часу не хапіла».

Навучанне ў вышэйшай школе заснавана на сумленнай, самастойнай працы студэнта. Яшчэ ў 1920 годзе ў прамове на III з'ездзе камсамола «Задачы саюзаў моладзі» У. І. Ленін адзначаў розніцу паміж новай і старой школай: «Старая школа была школай вучобы, школай муштры, школай зубрэння... Нам не патрэбна зубрэнне, але нам трэба развіць і ўдасканаліць памяць кожнага навучэнца веданнем асноўных фактаў...»

**Р. ГАЛУБЦОВА,**
**студэнтка журфака.**

# СТУДЭНТЫ-ВЫДАТНІКІ

## Іх правы і абавязкі

*(З ПАЛАЖЭННЯ АБ СТУДЭНТАХ-ВЫДАТНІКАХ БДУ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА, ПРЫНЯТАГА НА І ЗЛЁЦЕ ВЫДАТНІКАЎ УНІВЕРСІТЭТА)*

1. Выдатнікам лічыцца студэнт, які здаў на выдатна не менш дзвюх сесій запар і прымае актыўны ўдзел у грамадскім жыцці універсітэта, факультэта, курса і г. д.

2. СТУДЭНТ-ВЫДАТНІК АБАВЯЗАН:

а) быць актыўным барацьбітом за ажыццяўленне велічнай праграмы камуністычнага будаўніцтва, рыхтаваць сябе да жыцця ў грамадстве, якое сцвярджае на зямлі Мір, Працу, Свабоду, Роўнасць, Братэрства і Шчасце ўсіх народаў, звязваць сваю адукацыю і выхаванне з удзелам у будаўніцтве камунізма;

б) настойліва авалодваць ведамі, культурай, асновамі марксізма-ленінізма. Весці рашучую барацьбу з усімі праяўленнямі буржуазнай ідэалогіі, рознымі антыграмадскімі з'явамі, заўсёды ставіць грамадскія інтарэсы вышэй асабістых;

в) выхоўваць у сябе і ў таварышаў пачуццё савецкага патрыятызму, пралетарскага інтэрнацыяналізму, ідэйнай стойкасці і бязмежнай адданасці сацыялістычнай Радзіме;

г) смела змагацца супраць індывідуалізму і ўтылітарнасці, духоўнага мяшчанства і пасіўнасці, праяўленняў інертнасці ў некаторай часткі студэнтаў;

д) актыўна ўдзельнічаць у рабоце СНТ, весці пленную навуковую дзейнасць;

е) аказваць добраахвотную дапамогу адстаючым студэнтам;

ж) паказваць прыклад таварышам сваімі адносінамі да вучобы і грамадскай дзейнасці, паводзінамі ў быце, строга падтрымліваць вучэбную і камсамольскую дысцыпліну.

3. СТУДЭНТ-ВЫДАТНІК МАЕ ПРАВА:

а) адпаведна прадстаўленню савета выдатнікаў і рашэнню рэктарата універсітэта свабодна наведваць вучэбныя заняткі, за выключэннем лекцый і семінараў па грамадска-эканамічных дысцыплінах [1]).

б) наведваць лекцыі па любых курсах, якія чытаюцца на розных факультэтах, здаваць па гэтых прадметах экзамены і патрабаваць занясення атрыманай адзнакі ў заліковую кніжку;

в) выбіраць месца вытворчай і пераддыпломнай практыкі па асабістаму жаданню;

г) атрымаць любую вучэбную літаратуру ў бібліятэцы універсітэта звыш устаноўленых норм;

д) свабодна наведваць усе мерапрыемствы (акрамя платных), якія праводзяцца ў актавай зале універсітэта;
ле універсітэта;

е) атрымаць пуцёўкі ў дамы адпачынку і прафілакторый у першую чаргу;

ж) карыстацца перавагамі пры вырабе прыбораў і ўстановак у майстэрнях універсітэта;

з) карыстацца перавагамі пры размеркаванні на работу пасля заканчэння універсітэта.

4. Калі студэнт з'яўляецца выдатнікам на працягу ўсяго перыяду навучання ва універсітэце, яго імя заносіцца ў «Летапіс камсамольскай славы універсітэта».

5. Студэнт-выдатнік атрымлівае пасведчанне «Студэнт-выдатнік Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна».

6. Студэнты-выдатнікі выбіраюць савет выдатнікаў універсітэта, які

а) праводзіць штогадовыя злёты выдатнікаў;

б) па прадстаўленню дэкана і грамадскіх арганізацый факультэта рашае пытанне аб выдачы пасведчанняў «Студэнт-выдатнік БДУ» і аб прадаўжэнні тэрміну сапраўднасці пасведчання;

в) хадайнічае перад рэктаратам аб прадастаўленні права свабоднага наведвання заняткаў асобным студэнтам-выдатнікам;

г) каардынуе навукова-даследчую дзейнасць па праблемах узаемасувязі і суадносін вучэбнага працэсу і грамадскай дзейнасці студэнтаў-выдатнікаў.

[1]) Заўвага. Студэнт-выдатнік, атрымаўшы права свабоднага наведвання вучэбных заняткаў, павінен прымаць актыўны ўдзел у навуковай рабоце на адной з кафедр універсітэта.



Кафедра неарганічнай хіміі. Студэнт V курса Барыс Рэзнік і старшы тэхнік Юрый Марозаў праводзяць даследаванні фізіка-хімічных працэсаў, якія адбываюцца ў паўправадніковых матэрыялах пры траўленні.

Фота Д. ЧАХОВІЧА.

ПАТРАБУЕ РАШЭННЯ

# ЗРОБІМ НАШ СКВЕР ПРЫГАЖЭЙШЫМ

Амаль паўвека нашаму універсітэту. Але гады часта маюць цудоўную якасць — яны не старацъ, а маладзяць. І гэта відаць па таму, як растуць новыя сучасныя карпусы факультэтаў, як у цэлым мяняецца воблік універсітэцкага гарадка. І толькі нязменным застаецца універсітэцкі двор.

Быў тут некалі нядрэнны сквер. Частку яго занялі навабудоўлі, але сёе-тое засталося: нешматлікія дрэвы і кусты, фантан з недарэчнай скульптурнай групай, якая хоць і ўвасабляе вечнае юнацтва, але ўсё ж безнадзейна устарэла. Ёсць тут яшчэ скульптура — сімвалічная фігура жанчыны-маці, якая стаіць так, што яе амаль ніхто не бачыць. Відавочна, што гэтыя «творы мастацтва» не з'яўляюцца мастацкай каштоўнасцю. Тады ці не лепш ад іх пазбавіцца?

Я не хачу паўтараць прапісныя ісціны, што прыгожае заўсёды патрэбна чалавеку, што яно з'яўляецца неабходным элементам яго жыцця і г. д. Трэба, каб наш універсітэцкі двор стаў прыгожым. На жаль, няма пакуль што ў ім ні клумб, ні кветнікаў, ні прыгожых і зручных лавак, вельмі мала дрэў.

Натуральна, напрашваецца пытанне, чаму? Можа, няма дзе больш садзіць дрэвы, разбіваць кветнікі? Не, месца дастаткова, хапае. А жаданне зрабіць свой універсітэцкі гарадок больш прыгожым, добры густ і фантазія падкажуць, як лепш гэта здзейсніць. Зразумела, што самім студэнтам трэба ўзяцца за добраўпарадкаванне. Камітэт камсамола павінен выступіць арганізатарам масавага студэнцкага суботніка. Няхай будзе закладзен новы прыгожы сквер, які стане нашым любімым месцам адпачынку.

**А. ЦЯПЛЮК.**

# БУФЕТНЫЯ ТАРМАЗЫ

Амаль усе студэнты — філолагі і журналісты, якія жывуць у інтэрнаце, стараюцца раніцай прыйсці на заняткі раней, каб паспець паснедаць у буфеце. Асартымент у гэты час небагаты: смятана, булачкі (усё, канешне, учарашняе), кіслае малако і такі ж сок. Але, як кажуць, «на бязрыб'і і рак рыба». Даводзіцца быць задаволеным і гэтым. Тым больш, што буфет закрываецца ў 9.30 і адкрываецца толькі а 12-й гадзіне, бо па другія блюды і халодныя закускі буфетчыца едзе ў студэнцкую сталовую. Раней, чым у адзінаццаць гадзін, яе заяўку не задавальняюць.

А цяпер уявіце, што робіцца ў буфеце ў час вялікага (усяго 10 мінут!) перапынку... Пры усёй растаропнасці буфетчыцы абслужыць усіх яна не зможа.

У пачатку гэтага навучальнага года буфет вырашылі расшырыць за кошт невялікай аўдыторыі. Што ж атрымалася з гэтай рэканструкцыі? Дабавілі... адзін стол, усяго адзін! Згадзіцеся, што для такой колькасці студэнтаў сем сталоў у буфеце зусім недастаткова.

Некалькі месяцаў назад у буфеце паспрабавалі зрабіць «стол самаабслугоўвання». Вынік аказаўся нечаканы: калі падлічылі дзённую выручку, выявілі, што грошай не хапае, і буфетчыцы Я. А. Копчанка давялося пакрыць недастачу сваімі грашыма. Сорам, але гэта гаворыць аб несумленнасці некаторых студэнтаў.

Нядаўна зноў быў арганізаван стол самаабслугоўвання з прымяненнем некалькі іншай формы. З філалагічнага факультэта назначаюцца дзяжурныя, якія на дзень становяцца прадаўцамі-кантралёрамі. Буфетчыца працуе за стойкай, дзяўчаты — ля стала. «Прапускная здольнасць» буфета рэзка павысілася. Буфетчыца Я. А. Копчанка на маё пытанне, ці апраўдвае сябе стол самаабслугоўвання, з задавальненнем адзначыла:

— Канешне! Гэта ўжо не тое, што ў першы раз. Сёння здалі выручку, і мне не прыйшлося, як у першы раз, закладваць свае грошы.

— Значыць, такая форма абслугоўвання прымальная? Але, можа, ёсць яшчэ які-небудзь тормаз у вашай рабоце?

— Так, тормаз ёсць. Гэта— недахоп сталоў.

Нядаўна ў рэспубліканскім друку ішла размова аб сталовых і буфетах мінскіх ВНУ. Чамусьці да гэтай пары такому пытанню ўдзялялася вельмі мала увагі. Многа гавораць і пішуць аб гарадскіх і заводскіх сталовых, а пра вузаўскія маўчаць, хоць ёсць аб чым пагаварыць, што пакрытыкаваць і што пахваліць.

**А. ДЗЯЎГА,**
**студэнтка.**




# КЛЯТВА ПЕРШЫХ ВЫПУСКНІКОЎ

*Першы выпуск Беларускага дзяржаўнага універсітэта адбыўся ў 1925 годзе.*

*20 лютага гэтага года дыпломы атрымалі выпускнікі факультэта грамадскіх навук—эканамісты і прававікі. У дзень выпуску яны паслалі ураду БССР адрас. Гэты дакумент захоўваецца ў Дзяржаўным архіве Кастрычніцкай рэвалюцыі і сацыялістычнага будаўніцтва БССР. Тэкст яго надрукаван на развароце двух аркушаў чырвонай фарбай пад загалоўкам: «Рабоча-сялянскаму Ураду Беларускай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі ад студэнтаў першага выпуску факультэта грамадскіх навук Беларускага дзяржаўнага універсітэта».*

*У адрасе адзначаецца, што Беларускі універсітэт быў створан у цяжкі для рэспублікі час, калі яе гаспадарка была зруйнавана ў выніку першай сусветнай імперыялістычнай вайны і замежнай інтэрвенцыі, што, пераадольваючы вялікія цяжкасці, ён неўзабаве вырас у вышэйшы асветніцкі цэнтр, які шырока адкрыў дзверы для рабоча-сялянскай моладзі.*

*«Слава аб Беларускім дзяржаўным універсітэце,— пісалі далей выпускнікі, — перакінулася за межы нашай краіны. Яго значэнне расце, пашыраецца і мацнее з кожным днём. Сёння, у дзень выпуску, мы, студэнты-выпускнікі факультэта грамадскіх навук не можам не адзначыць тую вялікую працу, якая цалкам была выканана Урадам БССР у справе утварэння нашага універсітэта».*

*Маладыя спецыялісты запэўнілі урад БССР, што яны «прыкладуць усе сілы, каб апраўдаць сваё ІМЯ СТУДЭНТА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА». У канцы адраса яны пісалі: «Мы, студэнты, выносім Ураду у асобе Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта і Савета Народных Камісараў самую шчырую падзяку і заяўляем, што усе нашы пазнанні, атрыманыя ва універсітэце, аддамо справе ўзмацнення народнай гаспадаркі Рэспублікі і асвеце шырокіх мас рабочых і сялян...»*

*Гэты адрас—падзяку і клятву ураду Савецкай Беларусі падпісалі усе выпускнікі.*

*Нельга без хвалявання чытаць шчырыя словы студэнцкай клятвы свайму ураду, свайму універсітэту, бо мы ведаем, што гэта клятва была непарушнай.*

*Варта было б падумаць над тым, каб гэты прыклад першых выпускнікоў выпускнікі 70-х гадоў ператварылі ва універсітэцкую традыцыю.*

**Е. АБЕЦЭДАРСКАЯ.**


Рабоча-Сялянскаму Ураду

БЕЛАРУСКАЙ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ САВЕЦКАЙ РЭСПУБЛІКІ

Ад студэнтаў першага выпуску Факультэту Грамадзкіх навук БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСЫТЭТУ

---

НА КАФЕДРАХ І Ў ЛАБАРАТОРЫЯХ

# ШЛЯХ НАВУКОВАГА ПОСПЕХУ

**Кафедра радыётэхнікі і фізічнай электронікі існуе толькі два з палавінай года. Яна была створана у выніку рэарганізацыі кафедры эксперыментальнай фізікі і фізічнай электронікі. Пры кафедры існуе таксама навукова-даследчая лабараторыя.**

**Навуковыя даследаванні, што праводзяцца нашым калектывам, адносяцца да сумежнай галіны праблем фізікі цвёрдага цела і фізікі плазмы: даследуюцца электронныя працэсы, якія адбываюцца у кантактах паміж цвёрдымі целамі, а таксама паміж цвёрдымі целамі і газаразраднай плазмай.**

**Фізічныя з'явы, якія адносяцца да гэтай галіны, ляжаць у аснове дзеяння шматлікіх тэхнічных прыбораў сучаснай аўтаматыкі, тэхнічнай электронікі, навейшай электратэхналогіі.**

**Да гэтай галіны даследаванняў, нягледзячы на значныя эксперыментальныя і тэарэтычныя цяжкасці, падключаюцца усё новыя і новыя калектывы даследчыкаў. Стымулюе гэтую зацікаўленасць інтэнсіўнае развіццё мікраэлектронікі, у якой праблема фізікі кантактаў і пагранічных слаёў адыгрывае выключна важную ролю.**

**Навукова - даследчая работа кафедры па указанаму напрамку пастаянна каардынуецца з радам навукова-даследчых устаноў, дзе праводзяцца блізкія работы. Такімі з'яўляюцца інстытуты АН БССР: фізіка-тэхнічны, фізічны, цвёрдага цела і лаўправаднікоў, цепла- і масаабмену, Інстытут аўтаматыкі і тэлемеханікі АН СССР, Усесаюзны электратэхнічны інстытут і шэраг іншых навуковых устаноў.**

**Актыўная сувязь з гэтымі навуковымі установамі і каардынацыя даследаванняў з'яўляюцца надзвычай важнымі, улічваючы, што праблема фізікі і электронікі кантактаў мае даволі шматбаковы характар. З усяго мноства пытанняў на кафедры вывучаюцца галоўным чынам наступныя: даследаванне электронных працэсаў у кантактах металаў, сплаваў і валакністых структур; працэсаў, што адбываюцца у пагранічных слаях цвёрдых цел і газаразраднай плазмы пры іх узаемадзеянні; электронных працэсаў у складаных кантактах слаістых структур; вывучэнне аб'ёмных і эмісіенных уласцівасцей цвёрдых цел у сувязі з даследаваннем кантактных з'яў.**

**У даследаваннях разам з супрацоўнікамі і аспірантамі кафедры паспяхова удзельнічаюць студэнты трэцяга, чацвёртага і пятага курсаў, якія спецыялізуюцца па фізічнай электроніцы, працуе таксама некалькі студэнтаў малодшых курсаў. Некаторыя з іх ужо да пятага курса становяцца сааўтарамі навуковых артыкулаў.**

**Па указанай тэматыцы за апошнія два гады паспяхова абаронены дзве кандыдацкія дысертацыі — В. Я. Гракавым і У. М. Ткачэнкам; заканчвае работу над дысертацыяй В. А. Лапшын, у гэтым жа напрамку працуе і аспірант В. М. Табараў. Завяршаюць дысертацыйныя работы супрацоўнікі В. І. Лойка і А. З. Нікалаеня.**

**Бліжэйшай мэтай даследаванняў, якія праводзяцца у цяперашні час, з'яўляецца паглыбленне ведаў аб заканамернасцях, што характарызуюць сувязі велічынь токаў і напружанняў у зоне кантакту з фізічнымі параметрамі кантактуючых матэрыялаў, з іх макра- і мікраструктурай, вызначэнне гранічных рэжымаў кантактных сістэм, залежнасць уласцівасцей кантакту ад аб'ёмных і эмісіённых уласцівасцей кантактуючых цел і інш.**

**Рашэнне гэтых навуковых задач мае вялікае практычнае значэнне для адшукання шляхоў далейшага павышэння даўгавечнасці і надзейнасці многіх канструкцый, прыбораў і апаратаў тэхнічнай электронікі, а таксама шляхоў да стварэння новых прыбораў, якія выкарыстоўваюць кантактныя з'явы.**

**Вялікую ролю у навуковым выхаванні моладзі, што спецыялізуецца па фізічнай электроніцы, адыгрывае тая акалічнасць, што ужо з трэцяга курса (пачынаючы з першай курсавой работы) студэнты уключаюцца непасрэдна у даследчую работу той ці іншай кафедральнай групы (на кафедры іх 7) і з гэтага моманту дзеляць з ёй усе радасці і засмучэнні, асабліва непазбежныя у падрыхтоўцы і правядзенні эксперыментальных даследаванняў.**

**Абавязковы удзел у кафедральным семінары, а таксама у групавых субяседаваннях па бягучай рабоце развівае густ да асэнсавання праводзімага эксперыменту і атрыманых вынікаў. Поспеху нямала садзейнічае і тое, што у кожнай групе над прапанаваным планавым заданнем працуюць студэнты розных курсаў—кожны па сіле сваіх магчымасцей, ведаў і набытага вопыту. Для некаторых студэнтаў іх курсавая работа развіваецца затым у дыпломную, а дыпломная — у дысертацыю. Так узніклі дысертацыйныя тэмы былых аспірантаў У. М. Ткачэнкі, М. Ф. Меляшкевіч і аспіранта В. М. Табарава.**

**Вопыт паказвае, што для найбольш эфектыўнай падрыхтоўкі маладых кадраў на кафедры неабходна ужо з малодшых курсаў падбіраць студэнтаў, якія вызначаюцца не толькі сваімі здольнасцямі, але і дапытлівасцю, і вялікай працавітасцю. Уключаючы такіх студэнтаў у паслядоўныя этапы выканання кафедральнай навуковай тэматыкі, можна дасягнуць найбольшых поспехаў у іх навуковай падрыхтоўцы.**

**І. НЕКРАШЭВІЧ,**
**загадчык кафедры радыётэхнікі і фізічнай электронікі.**

---

# У ГАРНІЛЕ ЖЫЦЦЯ

## З ГІСТОРЫІ КАМСАМОЛЬСКАЙ АРГАНІЗАЦЫІ УНІВЕРСІТЭТА

СТУДЭНТЫ БДУ, ЯК І УВЕСЬ савецкі народ, з гатоўнасцю адклікаліся на важнейшыя міжнародныя падзеі. 18 сакавіка 1922 г. яны выказалі пратэст супраць празмерных прэтэнзій буржуазнага урада Пілсудскага па рэалізацыі Рыжскага дагавору. 15 мая 1923 г. яны разам з усім калектывам універсітэта выступілі у газеце «Правда» са зваротам «Да вучоных усяго свету» з выпадку правакацыйных дзеянняў англійскага урада. Па ініцыятыве таварыства Міжнароднай арганізацыі дапамогі рэвалюцыянерам, якое да пачатку 1926 г. аб'яднала кожнага шостага студэнта ва універсітэце, былі зроблены адлічэнні па 10 кап. ад поўнай стыпендыі і па 5 кап. ад паўстыпендыі у карысць баставаўшых англійскіх гарнякоў. Абурэнне выказалі студэнты на дэманстрацыі пратэсту у сувязі з забойствам савецкага пасла Войкава у 1927 г.

Унушальным адказам на варожыя вылазкі імперыялістаў было узнікненне у 1923—1926 гг. абаронных таварыстваў, ячэек. У пачатку 1927 г. усе яны зліліся у адзінае таварыства АСААВІАХІМ, у якім па стану на 1 лістапада налічвалася 876 студэнтаў універсітэта. Ад «кампанейскіх» метадаў работы ячэйкі перайшлі да бесперапынных планавых заняткаў па секцыях: ваенна-санітарнай, ваенна-палявой хірургіі, стралкова-тактычнай, ваеннай зброі, ваенна-хімічнай і артылерыйскай. З першых дзён 1927-1928 навучальнага года камсамольцы з энтузіязмам узяліся за вывучэнне ваеннай справы, прыцягваючы да гэтых заняткаў усіх студэнтаў.

Актыўная дзейнасць камсамольцаў у 1921—1928 гг. абумовіла колькасны і якасны рост арганізацыі. Асабліва павялічылася яна у час ленінскага прызыву. Часткай яго былі 224 студэнты БДУ, уступіўшыя у партыю і камсамол. Да 10-годдзя ВЛКСМ кожны чацвёрты студэнт універсітэта быў камсамольцам. Узмацніўся уплыў камсамола сярод несаюзнай часткі студэнцтва. Камсамольскі калектыў даў рашучы адпор кулацкім элементам ва універсітэце, якія спрабавалі правесці прынцып беспартыйнасці у жыцці студэнцтва, і асудзіў прымірэнчыя адносіны да іх.

Камсамольская і прафсаюзная арганізацыі праз свае секцыі здзяйснялі кіраўніцтва ячэйкамі, краязнаўчым таварыствам, гурткамі «Бязбожнік», «Эсперанто», струнна-музычным, драматычным, шахматным, спортгурткамі. Да грамадскай работы яны здолелі прыцягнуць 60 працэнтаў студэнтаў універсітэта. Студэнцкі актыў быў гатовы рашаць новыя складаныя задачы, паўстаўшыя перад савецкай вышэйшай школай у гады перадваенных пяцігодак.

Развіццё краіны выклікала неабходнасць карэнным чынам палепшыць падрыхтоўку кадраў інжынерна-тэхнічнай і навуковай інтэлігенцыі з рабочых і сялян, дабіцца больш цеснай сувязі навуковых даследаванняў з патрабаваннямі сацыялістычнага будаўніцтва. Цэнтр дзейнасці камсамольскай арганізацыі перамяшчаецца на акадэмічную работу. Камсамол заклікаў студэнтаў яшчэ больш настойліва авалодваць ведамі, актыўней уключацца у навуковыя даследаванні, пашыраць сувязі з вытворчасцю, цясней збліжацца з сярэдняй школай.

У час разгортвання культурнай рэвалюцыі партыя і урад надавалі выключнае значэнне пытанню пралетарызацыі саставу савецкага студэнцтва, папаўненню вышэйшай школы выхадцамі з працоўнага народа. Камітэт камсамола БДУ сумесна з выканаўчым бюро студэнцкай прафсаюзнай арганізацыі праявіў ініцыятыву у арганізацыі падрыхтоўчых курсаў для аказання дапамогі паступаючым у вну рабочым і сялянам. Спачатку былі адкрыты кароткатэрміновыя курсы, якія дзейнічалі у сакавіку — чэрвені 1928 г., а пасля, 20 верасня 1928 г.—дзевяцімесячныя. Яны былі укамплектаваны на 90 працэнтаў рабочай моладдзю і на 10 працэнтаў батракамі і чырвонаармейцамі.

Закончыўшыя курсы вызваляліся ад прыёмных экзаменаў пры паступленні у вну і на рабфакі. У якасці выкладчыкаў прыцягваліся студэнты старэйшых курсаў і супрацоўнікі універсітэта. Заняткі праводзіліся вечарамі. У 1929-1930 навучальным годзе выкладчыцкай работай было занята 97 студэнтаў IV курса педагагічнага факультэта. Акрамя курсаў пры універсітэце, камсамольцы БДУ арганізавалі падрыхтоўку рабочай моладзі для паступлення у вну непасрэдна на фабрыках і заводах.

Хуткі рост камсамольскіх радоў у сувязі з пралетарызацыяй вышэйшай школы (у 30-х гадах колькасць камсамольцаў склала 50 працэнтаў колькасці студэнтаў) патрабаваў ад кіруючых органаў шырока разгарнуць ідэйна-выхаваўчую работу. У 1932 г. у дапамогу камсамолу Беларусі ЦК ВЛКСМ паслаў 100 чалавек з ліку камсамольскага актыву Масквы, Ленінграда і іншых гарадоў.

Рашаючае значэнне па паляпшэнню камсамольскай работы мелі рашэнні X з'езда ВЛКСМ, які адбыўся у красавіку 1936 г. і прыняў новую праграму і новы статут ВЛКСМ. З'езд вызначыў рад канкрэтных мер па узмацненню выхаваўчай работы сярод моладзі і паляпшэнню арганізацыі яе вучобы і працы.

Выконваючы указанні X з'езда ВЛКСМ, камсамолія БДУ пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі прыкметна ажывіла работу па палітычнай асвеце моладзі. Узрасла колькасць слухачоў і гурткоў па вывучэнню гісторыі партыі, праграмы і статута камсамола, сталі часцей чытацца лекцыі аб міжнародным становішчы і на абаронныя тэмы.

Камсамольцы узначалілі паход студэнтаў за добрую паспяховасць. Перш за усё яны дапамаглі адміністрацыі навесці строгі улік наведвання лекцый і семінарскіх заняткаў. Пасля уключыліся у барацьбу за паляпшэнне якасці дыпломных работ. 28 чэрвеня 1936 г. «Чырвоная змена» пісала: «Дыпломы гэтага года стаяць на высокім тэарэтычным узроўні, намнога вышэй, чым у мінулыя гады. Студэнцкая моладзь смела штурмуе вяршыні навукі».

Калі у краіне разгарнуўся стаханаўскі рух, камсамольцы актыўна уключыліся у спаборніцтва пад дэвізам «Сустрэнем 20-годдзе ВЛКСМ выдатнай вучобай». Вынікі не замарудзілі сказацца. У 1938 г. 50 працэнтаў выпускнікоў фізмата (група фізікаў) здалі дзяржэкзамены толькі на выдатна. У 1938-1939 навучальным годзе са 114 выдатнікаў 94 былі членамі Ленінскага камсамола (у 1935-1936 навучальным годзе іх было 34, уключаючы і тых, хто меў выдатна хоць бы па аднаму прадмету).

Сур'ёзна аднесліся камсамольцы і студэнты да вывучэння новага курса «Асновы марксізма-ленінізма», уведзенага у праграму заняткаў у другім семестры 1938-1939 навучальнага года. З 926 упершыню экзаменаваных па гэтаму прадмету 677 былі камсамольцамі; на выдатна і добра экзамен здалі 619 чалавек, з іх 466 камсамольцаў.

**В. СІДАРЦОЎ,**
**кандыдат гістарычных навук.**

*(Працяг. Пачатак у № 12).*

# АМАТАРЫ МАСТАЦТВА

Ленінскі пакой інтэрната. Тут сабраліся студэнты гістфака, аматары літаратуры і мастацтва. Ідзе пасяджэнне «Клуба мастацтвау». Кожны жадаючы чытае вершы любімых паэтау, выказвае сваю думку аб тым ці іншым творы. І калі спачатку у невялікім пакоі было усяго чалавек 30, то ужо праз якія паугадзіны студэнтам не было месца сесці...

Шмат цікавых вечарау праходзіць на гістарычным факультэце. І не толькі на факультэце. Студэнты даволі частыя госці у падшэфных школах Стаубцоускага раёна. Цікавы вечар, напрыклад, быу наладжан гісторыкамі напярэдадні ленінскага юбілею. Госці сваім гаспадарам-школьнікам прачыталі лекцыю, паказалі канцэрт мастацкай самадзейнасці. На вечарах разам з вядомымі эстраднымі песнямі гучалі творы кампазітарау-класікау, чыталіся вершы, выконваліся танцы і невялікія сцэнкі са студэнцкага жыцця.

Аб поспехах артыстау-гісторыкау гавораць вынікі прайшоушага агляду-конкурсу мастацкай самадзейнасці, у якім яны занялі першае месца ва універсітэце. Але за гэтым поспехам — доугія гадзіны рэпетыцый, карпатлівая праца. Немалая заслуга тут і адказных за культурна-масавы сектар пры камітэце камсамола Акцябрыны Рашчынскай і Ігара Дубініна, якім дапамагаюць не толькі любоу да мастацтва, але і добрыя арганізатарскія здольнасці.

Ёсць на гістфаку і свой ансамбль, хор, вакальная група. Хочацца пажадаць усім гэтым калектывам, каб іх дружба з мастацтвам заусёды прыносіла вялікі плён.

**С. БУДЗЬКО,**
студэнтка.

# ДОБРЫ ПАДАРУНАК

Аб вялікай ролі У. І. Леніна і Камуністычнай партыі у стварэнні камсамола, у яго ідэйным і арганізацыйным умацаванні, у выпрацоуцы праграмы дзейнасці Камуністычнага Саюза Моладзі расказвае у сваей кнізе «Ленін—моладзі» прафесар нашага універсітэта А. Я. Журау.

Яшчэ у 1907 годзе у артыкуле «Антымілітарысцкая прапаганда і саюзы сацыялістычнай моладзі» У. І. Ленін падкрэсліу, што выпрацоука у юнакоу і дзяучат «яснага, цэльнага, сацыялістычнага светапогляду» — галоуная задача маладзёжных арганізацый.

Рад гістарычных фактау сведчыць аб тым, што заражэнне у моладзі безыдэйнасці і палітычнай беспрынцыпнасці — адзін з галоуных прыёмау ворагау рабочага класа, дэмакратыі, міру і сацыялізма. Вось чаму ленінскія вывады аб неабходнасці вучыцца камунізму маюць і цяпер неацэннае значэнне.

Уладзімір Ільіч прымау самы актыуны удзел у стварэнні самастойных маладзёжных арганізацый, у нараджэнні у нашай краіне камсамола. Гэтаму пытанню аутар прысвячае адзін з раздзелау кнігі. У ім расказваецца аб рабоце VI з'езда РСДРП, які адыграу асобую ролю у развіцці маладзёжнага руху і стварэнні юнацкіх арганізацый у Расіі. З'езд абмеркавау важнейшыя пытанні, звязаныя з падрыхтоукай сацыялістычнай рэвалюцыі, і у ліку іх — «Аб саюзах моладзі». Здзяйсненне рашэнняу гэтага з'езда прывяло да стварэння камсамола.

Многа месца у гэтай главе адводзіць аутар вялікай рабоце Н. К. Крупскай сярод моладзі. Яна часта выступала перад маладымі рабочымі і навучэнцамі, доуга гутарыла з імі. Сваімі думкамі і назіраннямі Надзежда Канстанцінауна дзялілася з Уладзімірам Ільічом і атрымлівала ад яго канкрэтныя парады і указанні. Як адзначае аутар, Крупская была як бы пасрэднікам паміж Леніным і юнацкім рухам.

Савецкі лад стварыу для моладзі спрыяльныя умовы для усебаковага развіцця. Яна атрымала магчымасць вучыцца, працаваць, актыуна удзельнічаць у палітычным жыцці краіны. Аутар прыводзіць многа прыкладау хуткага росту у 1918 годзе саюзау моладзі не толькі у гарадах, але і у вёсках.

Неабходна было аб'яднаць гэтыя саюзы у адзіную агульнарасійскую арганізацыю, выпрацаваць праграму, статут, вызначыць бліжэйшыя задачы. Ідэя склікання Усерасійскага з'езда саюзау моладзі належыць У. І. Леніну. На дакументальнай аснове аутар расказвае аб рабоце аргбюро па скліканню І з'езда саюзау моладзі, аб актыунай дапамозе у падрыхтоучы перыяд У. І. Леніна, Н. К. Крупскай і Я. М. Свярдлова. Многа месца адводзіцца асвятленню работы з'езда.

У. І. Ленін не мог прысутнічаць на І з'ездзе камсамола з-за ранення, а Н. К. Крупская — з-за хваробы. Але яны уважліва сачылі за яго ходам. У. І. Ленін выказау жаданне пагутарыць з дэлегатамі з'езда. На сустрэчу з Уладзімірам Ільічом прыйшлі члены прэзідыума з'езда.

Уладзімір Ільіч цікавіуся не толькі тым, як ідзе з'езд, але і тым, як жыве моладзь, аб чым думае, марыць. Неабходна быць на справе камуністам — такі быу ленінскі наказ прадстаунікам І Усерасійскага з'езда РКСМ.

Стварыушы камсамол, Камуністычная партыя прыняла дзейсныя меры дапамогі яго рабоце. Па распараджэнню У. І. Леніна камсамолу былі выдзелены грашовыя сродкі, наладжана выданне камсамольскіх газет і часопісау. Са снежня 1918 года стау выходзіць часопіс «Юны камуніст» — орган ЦК РКСМ.

Атрымаушы шырокую падтрымку Камуністычнай партыі, камсамол хутка стау мацнець і расці. Ужо у канцы 1919 года ён налічвау у сваіх радах 100 тысяч членау. Як указвае аутар, вялікая работа па стварэнню новых камсамольскіх арганізацый вялася і у Беларусі. Узніклі новыя арганізацыі у Віцебску, Оршы, Магілёве, Мінску, Бабруйску, Мазыры, Гомелі, Полацку і іншых гарадах.

З цікавасцю чытаецца раздзел кнігі, у якім расказваецца аб гераічных справах камсамольцау у цяжкія для краіны гады замежнай інтэрвенцыі і грамадзянскай вайны.

У маі 1919 года ЦК РКСМ аб'явіу усерасійскую мабілізацыю камсамольцау у Чырвоную Армію. Камсамольскія атрады ішлі на барацьбу з лозунгамі «Перамога або смерць!» Аутар прыводзіць рад прыкладау мужнасці і гераізму камсамольцау на франтах. Бясстрашна змагаліся камсамольцы таксама у падполлі і у партызанскіх атрадах.

Асаблівай увагі заслугоувае раздзел, дзе расказваецца аб III з'ездзе РКСМ. Аутар указвае, што з'езд сабрауся у Маскве у цяжкі гістарычны момант. Перад ім стаялі задачы: прыняць праграму РКСМ і вызначыць характар работы у новых умовах пераходу ад вайны да міру. Цэнтральнае месца у рабоце з'езда заняла прамова У. І. Леніна, з якой ён выступіу на першым пасяджэнні.

Прамова «Задачы саюзау моладзі» уся была звернута у будучыню. Глыбока прадуманая, падрыхтаваная загадзя, яна асвятляла самыя важныя праблемы жыцця і практычнай работы камсамола. У. І. Ленін вызначыу асноуныя задачы будауніцтва сацыялізма у нашай краіне. Ён заклікау моладзь аднавіць народную гаспадарку на новай тэхнічнай і эканамічнай аснове, вызначыу найпершую практычную задачу усёй савецкай моладзі — вучыцца.

Прамова У. І. Леніна на III з'ездзе РКСМ стала настауленнем не толькі для камсамола, але і для Камуністычнай партыі.

У апошняй главе А. Я. Журау на фактычным матэрыяле асвятляе жыццё камсамола краіны напярэдадні 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна, расказвае аб тым, як камсамольцы выконваюць запаветы Ільіча.

Кніга «Ленін — моладзі» пакідае добрае уражанне і з вялікай цікавасцю будзе сустрэта чытачамі. Добра аформленая, выкананая на высокім паліграфічным узроуні, яна з'яуляецца добрым падарункам выдавецтва «Народная асвета» моладзі рэспублікі.

**А. РАКОВІЧ,**
**кандыдат гістарычных навук.**

Мікола ПАНАСЮК

## *У НАШАЙ ВЁСЦЫ*

Дзяды у нашай вёсцы
палыселі:
Цяпер іх клопат — грэцца
ля прысад.
А ластаукі спрауляюць
наваселлі,
Ніоыта сто ці два гады
назад.
Таполі тут старыя
спілавалі.
Ля хат шаша раунюткая
лягла.
Адны бабулі звычай
захавалі:
Унукау водзяць сцежкамі
сяла.

Мігцяць ля весніц з раніцы
півоні
Чырвона-яркім водбліскам
мартэн,
А месяц, пахам саду
ап'янёны,
Зблудзіу у гушчары
тэлеантэн.
А у новай хаце Пішчыка
Давыда
Святло за поунач сеецца
з акна:
Шафёр калгасны кніжку
вершау выдау,
Цяпер яе чытае землякам.



СПАТКАННЕ. Фотаэцюд А. Ласмінскага.

Яўгенія ЯНІШЧЫЦ

* * *

Я хварэю даллю светла-
сіняй.
Лёгкі вецер ціш начную
студзіць.
Пішуць з дому, што траву
скасілі,
Буйную, з купавамі
па грудзі.
Ах, купавы — зелле мяты-
ружы.
Маладая, горкая атрута!
Я й сама, як ранняя
купава,—
Маладая,
горкая забава.

* * *

Я прыдумвала цяжка
цябе,
Як дзіця прыдумвае гукі,
Каб падоугу затым
Вымауляць любімае слова.
Я знайшла цябе у дождж.
(Ён бязлітасна падау,
шумеу у валасах).
І глядзела на твар,
Не падобны на іншыя
твары.
Знікнуу дождж. І каленяу
маіх вышэй
Паднялася трава маладая.
Толькі ты прамільгнуу
І твой след засланілі
купалкі.
Мне ж імя засталося тваё.
Я падоугу яго вымауляю,
Калі хочацца мне
адшукаць каханне.

# АРТЫСТ ЗАВАЁЎВАЕ ГЛЕДАЧА

Ёсць нямала п'ес, якія нават прафесійныя тэатры не адважваюцца ставіць. Гэта п'есы без ярка выражанай дынамічнасці дзеяння, без эфектных сцэн, без складанага сюжэта. Менавіта да такіх і адносіцца драма М. Алігер «Казка аб праудзе». Тут ёсць толькі людзі, толькі характары, толькі унутраная барацьба герояу. І поспех спектакля залежыць толькі ад саміх выканауцау.

Рэжысёр студэнцкага тэатра БДУ заслужаны артыст Літоускай ССР Аляксандр Міхайлавіч Озерау сумнявауся у выбары. Працаваць яму трэба было з тымі, хто упершыню выращыу выйсці на сцэну, а калі правалішся у першы раз, можаш больш ніколі не вярнуцца у тэатр.

Але работа пачалася. Тры месяцы напружаных рэпетыцый, тры месяцы пошукау, выпрабаванняу, спрэчак. І вось настау доугачаканы дзень. Прэм'ера!

Актавая зала галоунага корпуса. Гасне святло. І над прыціхшымі гледачамі гучаць словы: «Трэба ведаць прауду аб мінулым, каб лепш разумець сённяшняе».

Адкрываецца занавес. І пачынаецца барацьба... Барацьба за прызнанне. Барацьба паміж гледачом і акцёрам. У залу прыйшлі сябры і знаёмыя, аматары тэатра і проста скептыкі. Але цяпер усе яны стараюцца быць справядлівымі суддзямі.

Насцярожана сустрэла зала першую сцэну. Напружана, вельмі напружана трымаюцца рабяты. Яуна пераігрываюць. У вясёлых, жыццярадасных галасах адчуваецца дрыжанне.

— Калі я выбег на сцэну і убачыу паупустую залу, я спалохауся. Упершыню спалохауся залы, хоць дзесяткі раз чытау са сцэны вершы, —гаварыу пасля спектакля Віталій Мухін.

Справа у тым, што прэм'ера была на рэдкасць дрэнна рэкламавана.

Але вернемся да спектакля. На сцэне у натоупе вясёлых юнакоу і дзяучат мы пазнаём маскоускіх дзесяцікласнікау і сярод іх Зою Касмадзям'янскую. Вось яна кружыцца пад цудоуную музыку выпускнога вальса, вось урываецца у перапоунены ваенкамат.

І у другім дзеянні уся наша увага засяроджана на Зоі. Гледачы пачынаюць верыць, што гэта сапрауды Зоя. Так. Іменна так выглядала яна. Толькі яна магла гаварыць так усхвалявана, задушэуна, адчайна.

На сцэне няма дэкарацый, няма нічога адцягваючага увагу ад унутраных перажыванняу герояу.

Зоя і Барыс ідуць на апошняе заданне. Навокал пануры цёмны лес, глухая зімняя ноч. Не. Нічога гэтага няма. Але ніхто і не падумау, што магло быць інакш.

На засяроджаных тварах сіні начны свет. У цемры блукаюць фантастычныя цені, і хоць гучыць трывожная, напружаная музыка, здаецца, чуеш, як хрумсціць пад нагамі партызан тугі снег. У гэтым заслуга тых, каго не бачыць глядач: асвятляльнікау, гукарэжысёра, сцэнарыста — Люды Цішковай, Валодзі Шантрукова, Лены Кушнер, Галі Кузьміной, А. М. Озерава.

Найбольшае уражанне выклікае заключная сцэна. Збітая, абмарожаная Зоя ляжыць на пачарнелай ад крыві ляжанцы. Нібы прывіды, прыходзяць да яе маці, яе любы — Барыс, сяброукі. Яна памірае. Ёй хочацца жыць. Ёй хочацца вярнуцца у родную школу, дадому...

— Пойдзем з намі, — гавораць сяброукі.

Але Зоя выбірае смерць. Гордую смерць. Смерць, якая паслужыць сцвярджэннем яе вечнага жыцця.

Калі апусціуся занавес, зала узарвалася бурай апладысментау. Гэта была перамога!

Ролю Зоі выконвала студэнтка геафака Таня Філіповіч. Яна настолькі ужылася у вобраз сваёй гераіні, настолькі натуральна іграла, што пасля спектакля яе проста ніхто не мог пазнаць.

Удалася роля Барыса студэнту матфака Сашу Заратайскаму. Аднак яму яшчэ трэба папрацаваць. На фоне Зоі ён выглядау некалькі ненатуральна.

Хочацца адзначыць добрую ігру Н. Кузняцова, выканауцы невялікай ролі партызана. Перакаанауча выглядалі на сцэне Валодзя Туркін (сакратар гаркома), Юра Будзішэускі і іншыя.

Бясспрэчна, для маладога калектыву пастаноука «Казкі аб праудзе» — вялікі поспех. Наперадзе яшчэ многа работы, многа прэм'ер. Хочацца толькі далучыцца да пажадання рэжысёра, каб тэатр жыу паунакроуным жыццём і пасля заканчэння БДУ цяперашнімі артыстамі, каб калектыу яго папауняуся таленавітай зменай.

**І. ГЕРАСЮК,**
**студэнт.**

Рэдактар
**А. А. НІКОЛЕНКА.**

АТ 22688. Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоуны корпус, п. 106. Т-22-07-19. Друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. Тыраж 2000 экз. Зак. 663.